# АДКРЫЙЦЕ ЧАМАДАН...


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры ўзнікненні сумнення мытнікі раяць ісці ў чырвоны калідор. Там спецыялісты адкажуць на ўсе вашы пытанні. Дарэчы, вароты, праз якія праходзіць пасажыр, рэагуюць на рэчы з павышаным фонам радыяцыі.

— Выпадкаў незаконнага перамяшчэння крыніц радыеактыўнага выпраменьвання ў нас не было, але сістэма перыядычна спрацоўвае на багаж пасажыраў, радыяцыйны фон якога большы за норму, — гаворыць **начальнік мытні «Мінск-2» Андрэй МІХАЛЬКЕВІЧ.**

У той жа час, калі пасажыр толькі ўваходзіць у зону мытнага кантролю, уся інфармацыя пра яго і багаж ужо з'яўляецца на спецыяльных маніторах. Каб зразумець, што «гаворыць» інтраскоп, трэба ведаць яго «мову». Напрыклад, металічныя прадметы прыбор фарбуе ў сіні колер, арганіку — у цёмна-зялёны і аранжавы. У супрацоўнікаў мытні ёсць памятка, дзе пазначаны адценні усіх небяспечных рэчываў. На жаль, праслухаўшы кароткі інструктаж, вызначыць, ці ёсць пагроза ў тым ці іншым чамадане, у нас з фотакарэспандэнтам не атрымліваецца. Выява на маніторы больш нагадвае незразумелую дзіцячую размалёўку. Але, як кажуць спрактыкаваныя мытнікі, тут адной тэорыі мала.

— Усё прыходзіць з часам, патрэбен вопыт, — тлумачыць Андрэй Уладзіміравіч. — Такі прыбор і прафесійнае вока чалавека — магутны дуэт. На днях у багажы пасажыра знайшлі прадмет, які нагадваў агнястрэльную зброю. На шчасце, як высветлілі эксперты, гэта аказаўся муляж.

Падобныя экспертызы займаюць некалькі гадзін. Рэч абавязкова вернуць уладальніку.

## Газааналізатар, язва і «мяч з какаінам»

Усе аперацыі мытнага кантролю адбываюцца ў чырвоным калідоры, і менавіта там знаходзяцца неабходныя для гэтага прыборы. Газааналізатар, напрыклад, паказвае, ці ёсць на руках або сумцы сляды выбуховўкі, наркотыкаў, псіхатропаў. Вердыкт выносіцца за лічаныя хвіліны. Для гэтага неабходна спецыяльнай сурвэткай працерці рэчы пасажыра, якія не выклікаюць даверу, і ўставіць яе ў апарат. Калі высвечваецца надпіс «Няма трывогі», значыць, усё чыста, калі ж вынік адваротны — праца з пасажырам будзе працягнута.

— З дапамогай гэтага рэнтгенаўскага апарата супрацоўнікі мытні «змагаюцца» з глытальнікамі наркотыкаў, — указваючы на прыбор беларускага вытворцы ConPass кажа Андрэй Міхалькевіч. — Два гады таму затрымалі грамадзяніна Таджыкістана, у страўніку якога выявілі каля 600 грамаў гераіну.

Мытнікі распавядаюць, што цуда-прыбор выяўляе нават грыжы і язвы. Сканаванне займае 2 хвіліны, вывучэнне здымка — пяць-дзесяць.

Разам з людзьмі службу на мытні нясуць і сабакі. Парода чатырохногага памочніка тут значэння не мае. Галоўнае, як той казаў, жаданне і старанне. Праз тры месяцы інтэнсіўнай працы можна ўжо ўбачыць першыя вынікі. Самі наркотыкі службовыя сабакі не каштуюць. Замест гэтага іх вучаць спачатку шукаць мяч, а ўжо потым да яго падкладваюць рэчыва, якое ў будучыні трэба будзе знаходзіць па паху. Паступова сабака пазнае «водар» гашышу ці какаіну і калі штосьці знаходзіць, то прымае асаблівую позу, проста замірае на месцы. Для супрацоўнікаў мытні гэта знак.

## «Косці брата», гераін у страўніку і 9 тысяч пасылак

У зоне міжнароднага прылёту журналістам прапануюць самім праверыць багаж падазроных пасажыраў, у ролі якіх выступілі самі супрацоўнікі мытнай службы. Вызываюся добраахвотніцай. Шэраг пытанняў (кшталту: куды леціце, адкуль, з якой мэтай, якую суму грошай везяце) вынікаў не даў. Разам з каляжанкай прашу мужчыну ў капелюшы пакласці чамадан на стужку для сканавання.

— Гэта абрысы нейкай бляшанкі, цацкі і... чагосьці ўвогуле незразумелага, — нерашуча кажу я. — Шмат жоўтага колеру, значыць, арганіка. Але ці ёсць сярод гэтых рэчываў наркотыкі? — шукаю вачыма сапраўднага мытніка ў надзеі на падказку.

Відаць, ёсць. «Капаем» далей. Для гэтага просім пасажыра адкрыць чамадан. Адзенне, гарбата, цукар, лекі, цацка. Што з гэтага «наш» тавар — здагадацца цяжка. Але нечым мне ўсё ж такі не спадабалася каробка зефіру. Вырашаю яе прасканаваць і бачу, што нешта ў ласунку не так. Адкрываю ўпакоўку — гашыш (несапраўдны, зразумела). Але, на жаль, на гэтым мой поспех скончыўся. Яшчэ дзве заначкі так і засталіся некранутымі. Наркотыкі былі схаваныя ў відэакамеры і ў падшыўцы чамадана. Акрамя гэтага, як пазней прызнаўся пасажыр, «праглынуў» ён і добрую дозу гераіну.

— Я вам і так, і гэтак падказаць спрабаваў, — пачаў расказваць пасажыр. — І за жывот трымаўся, і лоб вадой змачыў, быццам у мяне тэмпература.

Для таго, каб ведаць, на каго і калі трэба глядзець, адных парад прафесіяналаў мала.

— У Беларусі спецыялістаў мытнай справы рыхтуюць тры вышэйшыя навучальныя ўстановы: БДУ, БНТУ, БДЭУ, — расказвае **начальнік аддзела кадраў і ідэалагічнай работы мытні Алена СЯМАШКА.**

Алена Валер'еўна працуе ў мытні больш за 20 гадоў. Якіх толькі гісторый не назбіралася за гэты час, усё і не ўзгадаеш! Вось адна з самых запамінальных.

— Аднойчы сустракала рэйс з Грузіі. Правяраю чамадан пасажыра і не магу зразумець, што такое прадаўгаватае знаходзіцца ў невялічкім слоіку. Пытаюся і чую ў адказ: «косці брата». На імгненне заміраю і гляджу на калегу: «Што ты пачула?» Яна кажа: «Косці брата». Задаваць іншыя пытанні сэнсу не было — пасажыр па-руску не гаворыць. На шчасце з гэтага ж рэйса падышоў яшчэ адзін грузін, які запытаў у свайго земляка, што той вязе і пераклаў нам. Гэта аказаліся падарункі. Я пытаюся, а з якой мэтай ён прыбыў у Беларусь, і чую ў адказ ад «перакладчыка»: «У госці да брата». І тут я разумею: «косці брата» — гэта і ёсць «у госці да брата». Грузін вывучыў адказ на самае распаўсюджанае пытанне — пра мэту візіту! А мы з-за акцэнту яго не зразумелі. У слоіку, дарэчы, аказалася вінаграднае лісце для далмы, згорнутае ў трубачку.

Спецыялісты мытні паказваюць тайнікі злачынцаў. Дзе і ў чым толькі не перавозяць наркотыкі! Кнігі, яблыкі, шарыкавыя ручкі, ежа, сістэмны блок — і гэта яшчэ не ўвесь спіс самых простых схованак.

— Фантазія ў такіх людзей багатая, вынаходлівасці хапае, — дадае Алена Сямашка. — Але ж і мы пастаянна ўдасканальваемся, рыхтуемся да сустрэч са «складанымі» пасажырамі.

Трэба дадаць, што на тэрыторыі аэрапорта працуе ўстанова міжнароднага паштовага абмену РУП «Белпошта», дзе таксама працуюць супрацоўнікі мытні. Менавіта сюды трапляюць адпраўленні, якія ў нашу краіну дастаўляюць самалётамі з розных краін. У змену тут працуе 11 спецыялістаў «Белпошты» і пяць мытных інспектараў. На апрацоўку паштовых адпраўленняў ідзе каля двух дзён, затым імі займаюцца мытнікі. Яны правяраюць пошту на рэнтгенаапаратах і з дапамогай сабак. Калі з пасылкай усё ў парадку, то паштовае аддзяленне адпраўляе яе адрасату. Калі ж ёсць падазрэнні на парушэнні, тады яна накіроўваецца на ручны мытны агляд. У пасылках можна знайсці ўсё што заўгодна: сякеры, наручнікі, прыцэлы да баявой зброі, манеты, наркотыкі.

Яшчэ адзін тэрмінал па апрацоўцы авіяпошты запрацуе тут сёлета ў другім паўгоддзі. У новым памяшканні плануецца апрацоўваць каля 30 тысяч адпраўленняў за суткі. Для параўнання: сёння гэтая лічба складае 9 тысяч.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

### Гэта цікава

**Акрамя чахлоў для тэлефонаў, зарадных прыстасаванняў і адзення беларусы заказваюць з Кітая і дзвярныя адмычкі. Для чаго — можна толькі здагадвацца. Але, як адзначыў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Юрый Сянько, гэтыя наборы адмычак настолькі прафесійныя, што дазваляюць нават непадрыхтаванаму чалавеку адкрыць практычна любыя дзверы. ДМК і органы ўнутраных спраў будуць надаваць асаблівую ўвагу людзям, якія падобныя рэчы спрабуюць купляць для сябе.**

---

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## КВЕТКІ, ЯКІЯ ТРЭБА СЕЯЦЬ У... СТУДЗЕНІ

**Зіма ў разгары, а вопытныя кветкаводы ўжо пачынаюць пасяўную кампанію. Выбіраем тыя кветкавыя культуры, у якіх тэрмін ад пасеву да пачатку цвіцення складае 130—180 дзён. У гэтую групу трапляюць як аднагадовыя, так і шматгадовыя марудлівыя расліны. Пасеяўшы іх да канца студзеня (у крайнім выпадку ў пачатку лютага), можна ўбачыць кветкі ўжо ў чэрвені. А шматгадовыя ў гэтым выпадку, што вельмі важна, зацвітуць у першы ж год!**

***Антырынум вялікі, ці львіны зеў***



Пасеяўшы насенне львінага зеву цяпер, вы атрымаеце да мая расаду, якая цвіце. Насенне не закопваем, а накрываем шклом або плёнкай. Прарошчваць трэба на святле, прыцяняючы ад прамых сонечных прамянёў. Тэмпература 15—20 °С. Усходы з'яўляюцца дружна праз 8-12 дзён. Сеянцы растуць вельмі павольна, таму іх пікіруюць праз месяц пасля з'яўлення ўсходаў.

Антырынум халадастойкі, святлалюбны, не засухаўстойлівы. Паліваем умерана. Цвіценне — з пачатку ліпеня і да позніх замаразкаў.

***Вербена гібрыдная***



Пасевы трымаем пры тэмпературы 18—20 °С. Насенне ўсходзіць на працягу 10—20 дзён, доўга і нядружна. Каб паскорыць прарастанне, яго добра патрымаць у любым стымулятары росту. Паколькі ўсходы адчувальныя да лішку вільгаці, паліваем іх акуратна, вадой пакаёвай тэмпературы і толькі пасля таго, як падсохне верхні слой субстрату. Падужэлыя сеянцы пікіруем, потым паступова загартоўваем.

Вербена святлалюбная, вельмі холадаўстойлівая і засухаўстойлівая. Цвіценне — з пачатку ліпеня і да позніх замаразкаў.

***Гайлардыя асцюкаватая***



Яркая шматгадовая расліна, якая часцей вырошчваецца як аднaлетнік.

Даволі буйнае насенне высейваюць па 4-5 штук у адзін гаршчок. Усходы з'яўляюцца праз 12—15 дзён.

Гайлардыя ўстойлівая як да слабых вясновых, так і восеньскіх замаразкаў. Як шматгадовая яна жыве нядоўга. Нармальна расце і шчодра цвіце толькі на сонечных участках з сухой рыхлай глебай. Можна размножваць і дзяленнем карэнішчаў.

***Гваздзік садовы***



Раскошны мнагалетнік, прадстаўлены самымі разнастайнымі сартамі з дробнакветкавымі суквеццямі.

Духмяныя кветкі з'яўляюцца толькі праз 5-6 месяцаў пасля пасеву, таму сеюць яго вельмі рана. Пры гэтым насенне раскладваем у баразёнкі глыбінёй 3 мм, зробленыя ў субстраце палачкай праз кожныя 2—2,5 см. Насенне засыпаем прагрэтым у духоўцы рачным пяском. Потым ёмістасць змяшчаем у поліэтыленавы пакет для захавання вільгаці, пасевы на падаконніку прыцяняем двайной газетай і трымаем пры тэмпературы 18—20 °С. Калі з'яўляюцца ўсходы, газету прыбіраем, а потым здымаем і пакет.

Гваздзікі добра растуць і цвітуць на адкрытых сонечных месцах з сухімі дрэніраванымі глебамі. Дрэнна пераносяць перасадку ў дарослым стане!

***Геленіум асенні***



Шыкоўная шматгадовая кветка, якая мае вялікую колькасць гібрыдных гатункаў, добра прыстасаваных да сучасных умоў.

Прыкладна праз 3 тыдні пасля ўсходаў, калі сеянцы стануць дастаткова моцнымі, іх трэба распікіраваць у асобныя збанкі і працягваць вырошчваць пры тэмпературы 15—18 °С у добра асветленым месцы. У канцы красавіка — пачатку мая расліны высаджваем у адкрыты грунт. Увесну яны прыжываюцца хутка і ў першае ж лета ўжо цвітуць. З кожным годам гэтая зімаўстойлівая расліна будзе рабіцца ўсё больш магутнай і цвісці больш багата.

Геленіум засухаўстойлівы, добра расце на адкрытых, сонечных месцах, якія ветраюцца, з добра дрэніраванай глебай.

***Дэльфініум гібрыдны***



Насенне высейваюць у скрыначкі або кантэйнеры і закопваюць у снег. Вясной усходы пікіруюць; перасаджваюць на пастаяннае месца ў стадыі 2-3 лістоў.

Дэльфініум святлалюбны, але можа пераносіць і невялікі ажурны цень. Добра расце і цвіце на суглінкавых ўрадлівых глебах нейтральнай рэакцыі. Паліў ўмераны, не выносіць пераўвільгатнення. Мае патрэбу ў рэгулярных падкормках. Расліны, якія зацвітаюць у год пасеву, жывуць нядоўга: 2-3 гады.

***Званочак карпацкі***



Цудоўны шматгадовы званочак, які можна вырошчваць і як аднaлетнік з сартамі белай, блакітнай і фіялетавай афарбовак. Гібрыды, якія з'явіліся ў апошні час у продажы, цвітуць у год пасеву.

Насенне ледзь-ледзь прысыпаюць зямлёй і змяшчаюць у вельмі светлае месца. Тэмпература ўтрымання 16—20 °С. Усходы з'яўляюцца праз 18—25 дзён.

Расліна непатрабавальная, зімастойкая. Добра расце як на сонцы, так і ў цені на любых добра дрэніраваных, някіслых, умерана вільготных глебах. Падаўжаюць цвіценне абразаннем адцвілых парасткаў.

***Кальцэалярыя маршчыністая***



Вельмі прывабны мнагалетнік, які вырошчваецца і як аднaлетнік. Цвіце без перадышкі з мая па верасень.

Пасеў насення павярхоўны, без закопвання — яго толькі накрываюць шклом або плёнкай. Утрымліваюць пры тэмпературы 10—15 °С. У добра асветленым месцы ўсходы з'яўляюцца праз 2-3 тыдні. Пікіруюць сеянцы праз месяц пасля з'яўлення ўсходаў. У сакавіку маладыя расліны перасаджваюць у гаршкі большага аб'ёму, а з сярэдзіны красавіка можна выстаўляць на сонечнае і абароненае ад ветру месца.

Расліны добра адгукаюцца (закладваецца шмат кветкавых пупышак) на падкормкі комплекснымі мінеральнымі ўгнаеннямі, якія праводзяць кожныя 2 тыдні. Субстрат у гаршку павінен быць пастаянна трохі вільготным.

***Лабелія***



Цудоўны аднaлетнік з вялікай разнастайнасцю сартоў; ёсць не толькі нізкарослыя, кампактныя, але і ампельныя формы.

Той, хто хоча ўжо ў маі высадзіць уласную расаду гэтай прыгажуні, ужо павінен сеяць яе насенне, бо ад яго прарастання да ўтварэння першых кветак пройдзе прыкладна 5 месяцаў. Насенне не закопваюць, а накрываюць шклом або плёнкай. Прарошчваюць на святле з прыцяненнем ад прамых сонечных прамянёў. Тэмпература 15— 20 °С. Усходы з'яўляюцца вельмі дружна праз 10—15 дзён. Маленькія сеянцы пікіруюць не раней чым праз месяц, па некалькі раслін разам.

Лабелія холадаўстойлівая, святлолюбівая, вільгацелюбівая, добра расце на рыхлых, лёгкіх глебах, не выносіць лішку арганічных угнаенняў. Цвіце з другой паловы чэрвеня і да позніх восеньскіх замаразкаў.

***Пеларгонія занальная***



Усходам гэтага доўгацвету патрабуецца добрае асвятленне і тэмпература 20—24 °С. У сакавіку сеянцы пікіруюць і пераносяць у больш халоднае памяшканне.

Пеларгонія добра расце на сонечных месцах з рыхлай урадлівай глебай. Паліў рэгулярны. Для атрымання густых раслін парасткі неаднаразова прышчыпваюць.

***Для пасеву можна выкарыстоўваць харчовыя кантэйнеры з вечкамі: з іх атрымліваюцца сапраўдныя міні-парнічкі, у якіх камфортна сеянцам. Такія ёмістасці лёгка праветрываць, празрыстае вечка прапускае дастаткова святла, а аб'ём нават зусім маленькага кантэйнера дазваляе выкарыстоўваць яго да самай пікіроўкі сеянцаў.***

---

## Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

УЗАЕМААДНОСІНЫ хросных бацькоў і хрэсніка

◈ Хросныя бацька і маці павінны паклапаціцца пра нацельны крыжык хрэсніка. Крыж і тасьму купляюць у храме.

◈ Для абраду хрышчэння шылі з новай, абавязкова белай (светлай) тканіны хрысцільны ўбор. Яго ўпрыгожвалі гафтам, карункамі. Спавівальнік (пояс, якім перавязвалі дзіця пасля спавівання) абавязкова быў чырвонага колеру. У храме хросная маці павінна была на працягу ўсяго абраду трымаць пялёнкі і спавівальнік, каб такім чынам «адзенне» хрэсніка таксама было асвячонае.

◈ Пасля таго, як дзіця тройчы апусцяць у купель з вадой, яго трэба было прыняць на белую пялюшку, якая пасля гэтага станавілася самым надзейным абярэгам для дзіцяці. Яе захоўвалі ўсё жыццё.

◈ Хросныя бацькі набывалі для хрэсніка імянную ікону — абраз святога, у гонар якога назвалі дзіця, каб азнаёміцца самім і расказаць хрэсніку, калі ён падрасце, жыццяпіс гэтага святога, навучыць малітве-звароту да свайго святога апекуна.

◈ Акрамя гэтага, ёсць малітвы, з якімі непасрэдна звяртаюцца да святога, у гонар якога названа дзіця, звяртаюцца ў горы і радасці, у хваробах і нягодах. Напрыклад, дзяўчынка па імі Ксенія павінна ведаць малітву, з якой звяртаюцца да святой Ксеніі Пецярбургскай — апякункі сямейнага шчасця, заступніцы ўсіх няшчасных і абяздоленых (дзень ушанавання — 6 лютага).

◈ Пакуль хрэснік падрастае і сталее, хросныя бацькі знаходзяцца побач, дапамагаюць яго духоўнаму станаўленню, прыводзяць у храм у святы, на споведзь і прычашчэнне. На працягу года існуе некалькі дзён, калі хрэснікі абавязкова прыходзяць у госці да хросных бацькоў і калі хросныя бацькі наведваюць хрэсніка.

◈ Так будзе працягвацца да вяселля хрэсніка, у правядзенні якога хросныя бацькі прымуць самы актыўны ўдзел: яны стануць сватамі і будуць побач з хрэснікам у момант сватаўства, у храме падчас шлюбу, спякуць і вынесуць да вясельнага стала знак сямейнага шчасця — вясельны каравай.

◈ Здавалася б, узаемаадносіны хросных бацькоў і хрэсніка на гэтым павінны скончыцца. Але існуе няпісанае правіла: хросныя бацькі да канца сваіх дзён моляцца за сваіх хрэснікаў, а хрэснік абавязаны праводзіць у апошні шлях сваіх хросных бацькоў.

---

## Даты Падзеі Людзі

**27 СТУДЗЕНЯ**

**1829** год — 190 гадоў таму нарадзіўся Міхаіл Яўграфавіч Салтыкоў-Шчадрын, рускі пісьменнік-сатырык, публіцыст. Яго светапогляд складваўся пад уплывам творчасці В. Бялінскага, М. Гогаля, А. Герцэна. Служыў у Міністэрстве ўнутраных спраў, віцэ-губернатарам у Разані, пазней — у Цверы. У 1863—1865 гг. супрацоўнічаў у часопісе «Современник». Аўтар цыкла сатырычных нарысаў і апавяданняў «Губернскія нарысы», «Гісторыя аднаго горада», рамана «Паны Галаўлёвы» і інш. Творчасць пісьменніка паўплывала на станаўленне камедыйнага жанру ў беларускай літаратуры, творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Крапівы, развіццё драматургіі, публіцыстыкі, тэатральнага мастацтва. У дарэвалюцыйны час мясцовыя і прыезджыя тэатральныя трупы паказвалі п'есы Салтыкова-Шчадрына ў Мінску, Гродне, Віцебску, Магілёве і Гомелі. У 1883 г. у Брэсце была паказана інсцэніроўка «Паны Галаўлёвы». На беларускую мову яго творы перакладалі К. Чорны, В. Вітка.



**1832** год — нарадзіўся Льюіс Кэрал, англійскі пісьменнік, матэматык, логік, філосаф, фатограф — ён напісаў і апублікаваў мноства работ па матэматыцы пад уласным імем — Чарльз Латуідж Доджсан. Тым не менш большасць людзей ведае яго як Люіса Кэрала — дзіцячага пісьменніка, аўтара казак «Аліса ў краіне цудаў», «Аліса ў Залюстаркоўі». Навуковыя працы Кэрала прысвечаны матэматычнай логіцы, і ў іх аўтар апярэдзіў многія з яе палажэнняў. Яшчэ адным вялікім захапленнем пісьменніка і матэматыка была фатаграфія, якой ён аддаваў шмат свайго часу.

**1932** год — нарадзіўся (вёска Бартнікі Баранавіцкага раёна) Аляксандр Уладзіміравіч Руцкі, беларускі вучоны ў галіне траўматалогіі і артапедыі, акадэмік НАН Беларусі (2002), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1982). Аўтар больш як 220 навуковых прац, у тым ліку 8 манаграфій, 9 патэнтаў і вынаходак. Выканаў фундаментальныя і прыкладныя даследаванні, накіраваныя на зніжэнне траўматызму, скарачэнне тэрмінаў лячэння, памяншэнне інваліднасці і смяротнасці. Распрацаваў бесцэментны двухполюсны эндапратэз тазасцегнавога сустава, на які атрыманы еўраазіяцкі патэнт. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992) за цыкл работ «Распрацоўка і ўкараненне ў практыку сасудзістай хірургіі новых метадаў дыягностыкі і лячэння».

### Было сказана

**Аляксей ПЫСІН, паэт:**
*«Відаць, там шчасце не канчаецца,
Дзе ёсць прычыны для трывог».*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.05 | 17.40 | 8.35 |
| Віцебск | — 9.00 | 17.24 | 8.24 |
| Магілёў | — 8.56 | 17.30 | 8.34 |
| Гомель | — 8.46 | 17.32 | 8.46 |
| Гродна | — 9.20 | 17.56 | 8.36 |
| Брэст | — 9.14 | 18.02 | 8.48 |

### Месяц

*Поўня 24.01—31.01.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

***Пр.** Ніны, Івана, Ільі, Іосіфа, Паўла, Сяргея, Сцяпана.*
***К.** Ангелікі, Анелі, Ілоны, Юрыя, Яна.*


Фота Ірыны СІДАРОК.

## ЗАЎТРА




---

## УСМІХНЕМСЯ

**Што рабіць, калі хацеў выцерці сваёй дзяўчыне слёзы, але выпадкова сцёр бровы?..**

— Чаго ў цябе выгляд такі стомлены?
— Захварэў.
— А чаму ў паліклініку не ідзеш?
— Жыць хачу.

**У жаніха не хапіла грошай на выкуп нявесты, таму вяселле перанеслі да палучкі.**

У першую шлюбную ноч новаспечаны муж пытаецца:

— Ганначка, дарагая, скажы мне адкрыта, я першы мужчына, які спіць з табой?

— Ну, калі ты збіраешся спаць, то так!



Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.956. Індэкс 63850. Зак. № 304.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 студзеня 2016 года.